Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

6 ЛІПЕНЯ 2017 г. ЧАЦВЕР №127 (28491)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Палацам і замкам — новае жыццё**

СТАР. 4



**Адна вёска... на дваіх**

СТАР. 13

ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА



**Шкляное рамяство**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Уладзімір КРАЎЦОЎ, старшыня Гродзенскага аблвыканкама:**

*«З тых людзей, хто звяртаецца па тэлефоне гарачай лініі, многія маглі б прыйсці на прыём асабіста. Безумоўна, прамыя лініі дазволілі мець больш цесныя зносіны з насельніцтвам і больш аператыўна рэагаваць на ўсе праблемныя пытанні, якія ўзнікаюць. Гэта дазваляе лепш валодаць сітуацыяй, працаваць у вырашэнні праблем на апярэджанне. Дзякуючы такому падыходу зменшылася і колькасць званкоў, што паступаюць на прамыя тэлефонныя лініі. У любым выпадку пытанні павінны вырашацца выключна ў рамках заканадаўства. Аднак людзям, якія з-за ўзросту, з іншых прычын не зусім дакладна арыентуюцца ў новых умовах, неабходна растлумачваць сітуацыю падрабязна».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 6.07.2017 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 1,9557 | ▲ |
| Еўра | 2,2213 | ▲ |
| Рас. руб. | 0,0328 | ■ |
| Укр. грыўня | 0,0749 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# У ПОШУКАХ СТАБІЛЬНАСЦІ

**Гэта падзея — гістарычная. Наша краіна ўпершыню прымае мерапрыемства такога маштабу. Больш за 600 гасцей з 57 краін прыехала ў беларускую сталіцу, каб высветліць, якім чынам варта ўмацоўваць узаемны давер і супрацоўніцтва ў Еўрапейскім рэгіёне. Учора ў Мінску сваю работу пачала 26-я летняя сесія Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Яе пленарнае пасяджэнне распачаў выступленнем Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**



Фота БЕЛТА.

## «Для народа робіцца нямала»

Па словах кіраўніка дзяржавы, у Беларусі робіцца ўсё, каб і прававу чалавека, і вяршэнства закона, і дэмакратыі ў краіне было не менш, чым у іншых дзяржавах Еўропы. «Пасля набыцця суверэнітэту мы паставілі перад сабой мэту пабудаваць дзяржаву для народа, дзе забяспечваецца поўнае і свабоднае развіццё асобы, захоўваюцца правы чалавека», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле слоў Прэзідэнта, найважнейшым элементам сістэмнага забеспячэння ўсяго комплексу правоў і свабод грамадзян стала распрацоўка першага ў гісторыі незалежнай Беларусі Нацыянальнага плана па правах чалавека. У яго рэалізацыю максімальна шырока ўключаны дзяржаўныя арганізацыі і грамадзянская супольнасць.

Кіраўнік дзяржавы звярнуў увагу, што ў краіне нямала робіцца для народа. Вырашана праблема беднасці, захоўваюцца высокі ўзровень сацыяльнага забеспячэння грамадзян і мінімальны разрыў у даходах розных слаёў насельніцтва. Кожнаму гарантавана права на атрыманне адукацыі, па даступнасці якой Беларусь не саступае самым высокаразвітым краінам.

«Наша дзяржава ўвайшла ў лік сусветных лідараў па ўзроўні развіцця аховы здароўя, медыцыны. Кожны грамадзянін незалежна ад дастатку мае магчымасць бясплатна атрымаць любы від медыцынскай дапамогі, у тым ліку самай высокатэхналагічнай», — канстатаваў беларускі лідар.

Беларусь 3 ліпеня адсвяткавала Дзень Незалежнасці, які адзначаецца ў дзень вызвалення Мінска ад фашызму. «Ён сімвалізуе гістарычную пераемнасць самастойнага шляху развіцця краіны, заснаванага на прынцыпах справядлівасці, сацыяльна-палітычнай стабільнасці, добрасуседства і шматвектарнасці знешняй палітыкі», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

СТАР. 2

MINSK, 5-9 JULY 2017
OSCEPA
26th Annual Session
Enhancing mutual trust and co-operation for peace and prosperity in the OSCE region

# Зрабіць арганізацыю больш дзейснай

**Прэзідэнт Беларусі заявіў аб неабходнасці рэфармавання АБСЕ**

**Перад адкрыццём 26-й сесіі Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з кіраўніцтвам ПА АБСЕ.**

Кіраўнік беларускай дзяржавы выказаў думку, што АБСЕ павінна рэагаваць на вострыя моманты ў еўрапейскім рэгіёне на самым высокім узроўні — кіраўнікоў дзяржаў. Негатыўнага ў Еўропе адбылося нямала, але іх рэакцыі не паступіла. «Вайна ідзе ў Еўропе — ніякай рэакцыі. Гэта сведчыць аб тым, што ў нас у арганізацыі ёсць праблемы», — заявіў беларускі лідар.

«Праблемы трэба вырашаць у пачатку, як і хваробу варта лячыць у самым пачатку. Калі мы запускаем гэты працэс, вы ведаеце, да чаго гэта прыводзіць. На падобныя канфлікты трэба рэагаваць, і рэагаваць сур'ёзна. Сёння ўсё больш і больш паўстае пытанне аб рэфармаванні АБСЕ, каб зрабіць яе больш дзейснай, рашучай», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што на Беларусь арганізацыя заўжды можа разлічваць, асабліва што датычыцца пытанняў бяспекі ў Еўропе. Прэзідэнт адзначыў, што цяпер існуюць канфлікты ў такіх рэгіёнах, як Украіна, Нагорны Карабах, Прыднястроўе. «Гэта вельмі важныя рэгіёны, дзе нам трэба па-еўрапейску, цывілізавана наводзіць парадак», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прытым актуальнасць гэтых пытанняў не толькі захоўваецца, але і ўзмацняецца. Зараз нарастаюць і атрымліваюць усё большую небяспеку працэсы нелегальнай міграцыі, транзіту наркотыкаў, гандлю людзьмі, нелегальнага перамяшчэння радыеактыўных элементаў і многія іншыя, якія не так на слыху. «Але калі мы не будзем бачыць гэтыя праблемы, гэта будзе страшны выбух у найбліжэйшы час», — дадаў кіраўнік дзяржавы.

У сваю чаргу старшыня ПА АБСЕ Крысцін Мутанен заявіла аб сваёй згодзе з пазіцыяй Прэзідэнта Беларусі ў частцы ролі арганізацыі ў пытанні забеспячэння міру і бяспекі. Па яе словах, парламентары актыўна займаюцца пытаннямі, якія паўстаюць перад рэгіёнам. І адной з важных для іх задач з'яўляецца стварэнне платформаў для таго, каб урады дзяржаў маглі прыцягнуць дыялог па пытаннях парадку дня. «Сёння мы ўсё часцей адзначаем блакаду дыялогу з боку ўрадаў некаторых дзяржаў-членаў. Таму мы вельмі рады магчымасці правесці чарговую сесію нашай арганізацыі ў Мінску, бо парламенцкая дэлегацыя Беларусі ў АБСЕ заўсёды была вельмі актыўнай», — адзначыла Крысцін Мутанен.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

■ Сітуацыя

# НАШЫ ЛЕКІ ЗА МЯЖОЙ

**Айчынныя лекі прадаюцца сёння амаль ва ўсіх кранах былога Саюза, у ЗША, Еўропе, нават Самалі, Іране і Афганістане. Для таго каб гэтага стала магчымым, давялося прайсці вялікі шлях. У рэканструкцыю і набыццё новых ліній самыя буйныя вытворцы прыцягнулі велізарныя інвестыцыі, выплачваюць сёння важкія сумы па крэдытах, аднак без гэтага вельмі сумна выглядаў бы і ўнутраны рынак, дый па заводскіх тэрыторыях гуляў бы вецер.**

Летась Беларусь экспартавала фармацэўтычнай прадукцыі на 115 млн долараў, з якіх 56 млн — доля толькі аднаго Барысаўскага завода медпрэпаратаў, лідара галіны. Планы на будучыню ў прадпрыемства грандыёзныя. І, безумоўна, гэта звязана з нарошчваннем экспарту. Практыка паказвае, што лекі рознага сегмен-



Фота БЕЛТА.

та запатрабаваны сусветным рынкам, а вось унутраны, айчынны, абмежаваны прыкладна 636 млн долараў у год. Інакш кажучы, айчынным вытворцам належыць сёння 51 працэнт рынку. Штогод у сістэме аховы здароўя рэгіструецца 116—120 лекавых прэпаратаў, галоўным чынам джэнерыкаў, формулы якіх добра вядомы, бяспечнасць і эфектыўнасць даказана. Асвойваецца і выпуск новых лекавых формаў.

— Праўда, далёка не ўсе 25 фармвытворцаў арыентуюцца на экспарт, — заўважае **генеральны дырэктар Барысаўскага завода медыцынскіх прэпаратаў Віталь ДЗЕРАШ.** — Выдаляць з рынку прыватныя або замежныя фармкампаніі, безумоўна, нельга, — сітуацыю павінен рэгуляваць рынак. Але ж на айчынным рынку шмат камерцыйных арганізацый, якія дублююць тое, што вырабляецца на дзяржаўных прадпрыемствах, і складаюць такім чынам штучную канкурэнцыю на ўнутраным рынку. Акрамя, бадай, лагойскага СТАА «Лекфарм», ніхто сярод прыватных фармвытворцаў асабліва і не займаецца асваеннем замежных рынкаў...

СТАР. 3